Вядучая рубрыкі Алена КРАВЕЦ.
Тэл. (017) 287-18-36.

Арганізм «наскрозь»

МРТ ці КТ і ў чым іх розніца?

Магнітна-рэзананснaя тамаграфія (МРТ) і камп'ютарная тамаграфія (КТ) — сучасныя апаратныя метады дыягностыкі. І той, і другі спосаб вывучае структуру тканак паслойна, а вынік даследавання пераўтварае ў серыю здымкаў, што дапамагае ўрачу дакладней паставіць дыягназ. Якія існуюць супрацьпаказанні для МРТ і КТ? Ці варта настойваць на правядзенні гэтых абследаванняў і як часта іх можна праходзіць? Ці можна рабіць МРТ, калі на целе маюцца татуіроўкі? З гэтымі і іншымі пытаннямі дапамагла разабрацца кандыдат медыцынскіх навук, дацэнт, загадчык рэнтгеналагічнага аддзялення медыцынскага цэнтра «ЛАДЭ» Таццяна ЛУК'ЯНЕНКА.

Фота Алены КАРХУ.

— Таццяна Мікалаеўна, у якіх выпадках выконваецца МРТ і КТ? У чым іх перавага над звыклымі рэнтгенам і УГД?

— Прамянёвая дыягностыка сёння мае вялікую разнастайнасць метадаў. Гэта і ўльтрагукавая дыягностыка, і рэнтгеналагічныя метады, і камп'ютарная тамаграфія, і магнітна-рэзананснaя тамаграфія, і радыенуклідныя даследаванні. У тым ліку ў нашай краіне даступная гібрыдная візуалізацыя. Гэта пазітронна-эмісійная тамаграфія, сумешчаная з КТ (ПЭТ/КТ). Да кожнага з гэтых метадаў ёсць паказанні і супрацьпаказанні, гэтак жа як існуюць магчымасці і межы таго ці іншага абследавання.

МРТ і КТ — высокаінфарматыўныя метады, накіраваныя на дыферэнцыяльную дыягностыку, і выкарыстоўваюцца часта для ўдакладнення дыягназу. На першым узроўні візуалізацыі пацыент праходзіць УГД ці рэнтгеналагічнае даследаванне. Часам гэтага дастаткова, каб растлумачыць тую ці іншую сімптаматыку. Пры неабходнасці прызначаюцца КТ ці МРТ. Ёсць пералік клінічных, інструментальных, лабараторных даследаванняў, якія павінны быць выкананы, перш чым пацыент звернецца да высокатэхналагічных метадаў. І ўрачы прамянёвай дыягностыкі, і ўрачы клінічных спецыяльнасцяў працуюць строга па алгарытме — ад простага да складанага. Толькі ў рэдкіх выпадках абмінаецца першы этап і пачынаюць адразу з больш складаных метадаў. Такая практыка распаўсюджана і ў свеце.

— Ці трэба самому настойваць на правядзенні КТ ці МРТ?

— Усе віды рэнтгенаграфій, да якіх адносіцца КТ, у тым ліку КТ у стаматалогіі, суправаджаюцца прамянёвай нагрузкай, бо ў аснове метаду — крыніца іанізавальнага выпрамянення. Спецыялісты прамянёвай дыягностыкі загадзя інфармуюць пацыента і атрымліваюць яго згоду на абследаванне. Памер прамянёвай нагрузкі залежыць і ад абсталявання. Цяпер выкарыстоўваюць пераважна шматзрэзавыя камп'ютарныя тамографы.

Што датычыцца МРТ, то на дадзены момант няма навукова даказаных фактаў яе шкоднага ўплыву на арганізм. Гэтае даследаванне не суправаджаецца прамянёвай нагрузкай, і ў пэўных выпадках МРТ робіцца нават дзецям.

— Колькі разоў на год можна рабіць МРТ?

— Неабмежавана.

— Каб абследавацца на наяўнасць, напрыклад, злаякасных пухлін, можна зрабіць КТ усяго арганізма?

— Такая працэдура не гарантуе бяспекі. У прафілактычных мэтах КТ не выконваюць, бо будуць перавышаны дозавыя прамянёвыя нагрузкі.

— З гэтых прычын многія не жадаюць рабіць і флюараграфію...

— Адназначна можна сказаць, што падчас планавага прафілактычнага абследавання лёгкіх, што дапамагае своечасова выявіць паталогію з боку органаў дыхання (туберкулёз, рак лёгкіх і інш.), пацыент атрымлівае мінімальную нагрузку пры максімальнай дыягнастычнай інфармацыі. Сёння ўстановы аховы здароўя набываюць сучаснае рэнтгенаўскае абсталяванне, лічбавыя апараты, якія адпавядаюць патрабаванням якасці Сусветнай арганізацыі аховы здароўя. Адна флюараграфія на год не перавысіць гадавую дозу прамянёвай нагрузкі. Аднак нельга забываць і аб магчымасцях КТ, якая з'яўляецца «залатым стандартам» для дыягностыкі паталогіі органаў дыхання, асабліва калі маецца неадпаведнасць клінічных і лабараторна-інструментальных дадзеных.

Магчымасці сучасных магнітна-рэзананснaых тамографаў дазваляюць выканаць МРТ усяго цела. Наш цэнтр, напрыклад, у хуткім часе збіраецца ўстанавіць новы апарат МРТ, пры дапамозе якога можна выканаць гэту працэдуру. Акрамя таго, ён ліквідуе фізіялагічныя артэфакты, абумоўленыя рухамі пацыента (дыхання, глытання і інш.), што вельмі важна для дыягностыкі. Калі параўноўваць з КТ ці рэнтгенаграфіяй, то МРТ усё ж дастаткова доўгая працэдура — 20—25 хвілін. Рэнтгенаграфія і КТ займаюць ад некалькіх секундаў да некалькіх хвілін.

— У якіх выпадках робіцца МРТ, а ў якіх КТ?

— Гэта вызначае спецыяліст згодна з дакладным алгарытмам. У якасці прыкладу прывяду выбар метадаў пры абследаванні галавы і шыі. Пры падазрэнні на наяўнасць аб'ёмнага паталагічнага ўтварэння, пераломах асновы і зводу чэрапа, іншых траўмах, парушэннях унутрымазгавога кровазабеспячэння выконваецца КТ. У такіх выпадках, улічваючы экстранасць, гэта дае магчымасць хутка вызначыцца з дыягназам. Аднак самыя ранняя змяненні пры парушэннях унутрымазгавога кровазабеспячэння магчыма выявіць пры выкананні спецыяльных МР-дыфузійных праграм (ранняй дыягностыкі інсультаў).

МРТ робіцца пры анамаліях развіцця галаўнога мозга, падазрэннях на наяўнасць паталагічных утварэнняў у поласці чэрапа, рэцыдывах пасля хірургічнага і камбінаванага лячэння. Пры дэміелінізуючых захворваннях (цэнтральнай і перыферычнай нервовай сістэмы. — **«Зв.»**), а гэта вялікая група, пры тым жа рассеянным склерозе таксама карыстаюцца МРТ, бо КТ мае нізкую адчувальнасць. Пры сасудзістых мальфармацыях, падазрэннях на анеўрызму, стэнозах таксама робіцца МРТ з выкананнем спецыяльных сасудзістых праграм — МР-ангіяграфіі і МР-венаграфіі.

— Ці ёсць абмежаванні і супрацьпаказанні для гэтых абследаванняў?

— Што датычыцца МРТ, то ёсць пералік абсалютных і адносных супрацьпаказанняў. Сярод абсалютных — наяўнасць кардыёстымулятара, ферамагнітных электронных імплантаў сярэдняга вуха, іншых вялікіх імплантаў, ферамагнітных сколкаў, ферамагнітных іншародных цел, кроваспыняльных кліпсаў сасудаў галаўнога мозга, магчымых металічных канструкцый. Праўда, цяпер выкарыстоўваюцца пераважна тытанавыя канструкцыі, яны не з'яўляюцца ферамагнітамі. У такіх выпадках мае сэнс выканаць КТ. Адносныя супрацьпаказанні — інсулінавыя помпы, нервовыя стымулятары, неферамагнітныя імпланты сярэдняга вуха, пратэзы клапанаў сэрца, клаўстрафобія, асаблівы стан пацыента, у прыватнасці псіхаматорнае ўзбуджэнне. Перманентны макіяж, татуіроўкі не з'яўляюцца адназначным супрацьпаказаннем, але ў кожным выпадку індывідуальна мы вырашаем, ці паўплываюць яны на вынік, бо такі малюнак часам змяшчае дадатковыя мігатлівыя кампаненты, якія могуць аказацца ферамагнітамі. Кольцы для пірсінгу і іншыя металічныя ўпрыгажэнні, токаправодзячае адзенне, гадзіннікі, акуляры загадзя прапануем зняць, дастаць з кішэняў карткі і тэлефоны. Пры цяжарнасці ад МРТ лепш устрымацца ў першым і апошнім трыместрах, ад КТ — тым больш. Пры выкананні КТ тыя ж абмежаванні, што і пры рэнтгенаўскіх метадах, што звязана з дозавымі межамі.

— Ці часта даводзіцца выяўляць запушчаныя выпадкі раку? Як пра анкалагічнае захворванне паведаміць блізкім і самому хвораму?

— Казаць пра гэта заўсёды складана. Але пацыент мае права ведаць, у тым ліку каб своечасова было прызначана лячэнне, каб быў правільны алгарытм яго маршрутызацыі да спецыялістаў. Калі ёсць праблема, мы кажам пацыенту, што патрабуецца кансультацыя ўрача-анколага, заўсёды адлюстроўваем гэта ў пратаколах, каб хворы ішоў па правільным шляху.

Сапраўды бываюць познія звароты і да ўрача-клініцыста, і да ўрача прамянёвай дыягностыкі. Тут вельмі важна, каб правільна былі прызначаны метады абследавання і выконваўся алгарытм для дыягнастычнага пошуку. Гэта ўжо задача спецыяліста — правільна накіраваць пацыента на высокаінфарматыўныя метады: МРТ ці КТ або ангіяграфічныя даследаванні, у тым ліку і ПЭТ/КТ, каб хутка паставіць дыягназ і своечасова пачаць лячэнне.

Сімптом хваробы ці часовая нязручнасць?

Чаму ацякаюць ногі

Часам, асабліва ў летнюю спёку, можна заўважыць, што ногі значна павялічыліся ў памеры і басаножкі сталі цесныя. Ацёкі, як правіла, не суправаджаюцца моцным болем, дастаўляюць толькі візуальны дыскамфорт. Нярэдка гэтыя сімптомы ігнаруюць, не спяшаюцца паказацца ўрачу. І дарэмна!

— Ацёчнасць можа сведчыць пра запушчаную хваробу. І, своечасова звярнуўшыся да доктара, вы можаце прадухіліць развіццё сур'ёзнага захворвання, — папярэджвае **ўрач агульнай практыкі 11-й гарадской паліклінікі г. Мінска Марыя ШЛЫК.** — Вельмі важна вызначыць, чым выкліканы ацёкі, каб ліквідаваць першапрычыну. Найчасцей яны звязаны з варыкозным пашырэннем вен, але могуць сігналізаваць і пра іншыя непаладкі ў арганізме.

Прычына № 1 — захворванне вен

Гэта самая распаўсюджаная прычына, у прыватнасці варыкоз, стан пасля перанесенага трамбозу вен, а таксама хваробы лімфатычнай сістэмы.

Характэрнай прыкметай «вянозных» ацёкаў з'яўляецца аднабаковасць: ацякаць можа адна канечнасць. Акрамя таго, яны часта суправаджаюцца пашырэннем вен. Яшчэ адной прыкметай немачы ад хваробы вен з'яўляецца часовасць: ацёчнасць звычайна з'яўляецца ў другой палове дня і за ноч праходзіць. Калі ж ацёкі ног захоўваюцца да раніцы, прычыну варта шукаць у іншым.

Пры падазрэнні, што ногі ацякаюць ад захворвання вен, не зацягвайце, запішыцеся на прыём да флеболага, каб прайсці УГД вен. Для прафілактыкі «вянозных» ацёкаў варта прытрымлівацца бяссолевай дыеты і аптымальнага рэжыму піцця. Пастарайцеся пазбягаць доўгіх нерухомых поз і больш гуляйце пешшу. Таксама карысны будзе кампрэсійны трыкатаж.

Прычына № 2 — паталогія сэрца

Так званыя сардэчныя ацёкі ўзнікаюць найчасцей у пажылых людзей з запушчанымі хваробамі сэрца і гіпертаніяй. Характэрным маркерам ацёчнасці ад сардэчнай недастатковасці з'яўляюцца сталы ўзрост і наяўнасць сардэчнай паталогіі. Пацвердзіць ці абвергнуць гэтую прычыну дапаможа праходжанне кардыяграмы і УГД сэрца.

Прычына № 3 — хваробы нырак

Адметная асаблівасць «ныркавых» ацёкаў — наяўнасць іх раніцай і ацёчнасць на твары. Да таго ж гэта заўсёды двухбаковы ацёк. Калі ў вас здарылася пераахалоджанне ці парушана функцыя мочаспускання, хутчэй за ўсё ацёчнасць выклікана хваробай нырак. Пры такіх падазрэннях рэкамендуецца зрабіць УГД нырак і здаць аналіз мачы, а таксама пракансультавацца з нефролагам ці ўролагам.

Акрамя пералічаных трох асноўных прычын, існуюць і іншыя, больш рэдкія. Напрыклад, захворванні палавой сістэмы і парушэнні работы наднырачнікаў.

Прычына № 4 — захворванні шчытападобнай залозы

Яна рэгулюе работу ўсіх залоз у арганізме. Калі шчытападобная залоза не ў парадку, магчымыя праблемы ў сістэме жаночых палавых органаў ці рабоце наднырачнікаў, што ў сваю чаргу можа быць прычынай ацёчнасці ног. Да ацёкаў могуць прыводзіць змены гарманальнага фону ў жанчын, а таксама анкапаталогія прастаты ў мужчын.

Прычына № 5 — паталогія наднырачнікаў

Адутлаватасць твару можа сведчыць пра тое, што прычына ацёчнасці заключаецца ў парушэнні работы наднырачнікаў ці нырак.

У некаторых выпадках ногі могуць ацякаць ад паталогій работы адразу некалькіх органаў, напрыклад сэрца і нырак адначасова. Гэта ўскладняе пошук першапрычыны. Таму не варта займацца самалячэннем, пры з'яўленні ацёкаў звярніцеся да доктара — профільнага, калі заўважылі яўныя сімптомы з пералічаных, ці да тэрапеўта, калі прычына пакуль не яўная.

К@нтыненты

МОСТ ПРАЗ АТЛАНТЫКУ

Чаму Еўропа і Паўднёвая Амерыка заключылі «дамову стагоддзя»?



Еўрапейскі саюз падпісаў найбуйнейшае ў сваёй гісторыі гандлёвае пагадненне. Гэтая дамова адкрывае бізнесу Старога Свету дзверы на рынак чатырох краін Паўднёвай Амерыкі з насельніцтвам каля 300 мільёнаў чалавек. У адказ Бразілія, Аргенціна, Парагвай і Уругвай (аб'яднаныя ў субрэгіянальны гандлёва-эканамічны саюз Меркасур) атрымаюць ільготны доступ да паўмільярда еўрапейскіх спажыўцоў. Пасля 20 гадоў перамоў 28 краін ЕС пагадзіліся прыадкрыць граніцы для заакіянскага мяса і цукру ў абмен на магчымасць бяспошлінна пастаўляць у Паўднёвую Амерыку аўтамабілі, лекі, віно і сыр, перадае «Бі-бі-сі». Больш за тое, перагаворшчыкі пайшлі далей і акрамя абнулення пошлін у гандлі таварамі — сельскагаспадарчымі і прамысловымі — дамовіліся зняць частку нетарыфных абмежаванняў для ключавога сектара паслуг, у тым ліку дзяржзакупак, санітарных нормаў, аўтарскіх правоў. Чаму найбуйнейшыя сусветныя гульцы вырашылі дамовіцца, чаго чакаць у перспектыве?

ПАЎДНЁВЫ КРЫЖ

Меркасур (Mercado Comu'n del Cono Sur — Mercosur) — субрэгіянальны гандлёва-эканамічны саюз, у які цяпер уваходзяць Аргенціна, Бразілія, Парагвай і Уругвай. З іспанскай назва перакладаецца як «Рынак Паўднёвага конуса» — па назве часткі тэрыторыі Паўднёвай Амерыкі, размешчанай на поўдзень ад 18 градусаў паўднёвай шыраты. На эмблеме арганізацыі намалявана сузор'е Паўднёвага крыжа. На гэтай тэрыторыі жыве больш за палову насельніцтва краін Лацінскай Амерыкі і Карыбскага басейна. Меркасур фарміруе каля 75 працэнтаў сукупнага ВУП Паўднёвай Амерыкі. Аб'яднанне ўяўляе сабой па памерах і эканамічным патэнцыяле другі ў свеце (пасля ЕС) мытны саюз.

Спробы развіваць тут рэгіянальную эканамічную інтэграцыю на ўзор Еўрасаюза маюць доўгую, але не вельмі ўдалую гісторыю. Яшчэ ў 1960-х у Паўднёвай Амерыцы ўпершыню загаварылі пра стварэнне зоны свабоднага гандлю, а затым і цэнтральнаамерыканскага агульнага рынку. У 1960-м была створана Лацінаамерыканская асацыяцыя свабоднага гандлю (LAFTA), у якую ўвайшлі 10 краін (Аргенціна, Бразілія, Мексіка, Уругвай, Парагвай, Перу, Чылі, Калумбія, Эквадор, Венесуэла і Балівія). Аднак палітычныя і эканамічныя крызісы канца 1960-х не дазволілі ажыццявіць гэты грандыёзны праект. З прычыны моцных адрозненняў паміж дзяржавамі далейшыя спробы развіцця рэгіянальнай эканамічнай інтэграцыі былі накіраваны на аб'яднанне толькі некаторых краін, эканамічна найбольш блізкіх адна да адной. Так, у 1969 годзе ўнутры LAFTA ўтварылася андская група (Балівія, Калумбія, Эквадор і Чылі). Але гэтыя альянсы не здолелі дамагчыся асаблівых поспехаў у развіцці ўзаемнага гандлю.

Новая хваля ўвагі да інтэграцыйных пагадненняў паднялася ў 1980-я, калі расчараванне лацінаамерыканскіх краін у дапамозе ЗША пасля Фалклендскай вайны Аргенціны з Вялікабрытаніяй стымулявала іх цікавасць да збліжэння на рэгіянальнай аснове. У 1985 годзе прэзідэнты Аргенціны і Бразіліі — Рауль Альфансін і Жазэ Сарней — падпісалі Праграму эканамічнай інтэграцыі і супрацоўніцтва. Адной з шэрагу мер прапанавалася ўвесці выкарыстанне гаўча ў якасці валюты для рэгіянальнага гандлю. Дзве найбуйнейшыя эканомікі Лацінскай Амерыкі вылучылі сумесны праект развіцця супрацоўніцтва і наступнай інтэграцыі, абвясціўшы яго адкрытым для далучэння іншых краін. Уругвай і Парагвай неўзабаве адгукнуліся на гэтую ініцыятыву. У сакавіку 1991 года ў парагвайскай сталіцы Асунсьён быў падпісаны чатырохбаковы дагавор аб стварэнні мытнага саюза і агульнага рынку. У 1995-м ён уступіў у сілу — на знешніх межах блока пачалі дзейнічаць агульныя мытныя тарыфы на імпарт тавараў з трэціх краін.

Эксперты адзначаюць, што стварэнне блока неаднойчы дапамагала стабілізаваць эканоміку краін, якія ў яго ўваходзяць. Напрыклад, у перыяд эканамічнага застою ў Бразіліі ў 1991—1993 гадах мясцовая прамысловасць здолела выжыць у значнай меры дзякуючы доступу на рынак Аргенціны, эканоміка якой у той час была на ўздыме. А ў 1994—1995-м, ва ўмовах эканамічнага спаду ў Аргенціне, выратавальным кругам для яе стаў доступ на рынак Бразіліі, які ў той час дынамічна развіваўся. Чылі, Калумбія, Балівія, Эквадор, Перу, Гаяна і Сурынам цяпер маюць статус асацыяваных членаў. Мексіка і Новая Зеландыя кваліфікуюцца як афіцыйныя назіральнікі. Таксама праводзяцца кансультацыі аб пашырэнні супрацоўніцтва з Кубай.

ГУЛЬНЯ ПА ПРАВІЛАХ

Перамовы паміж ЕС і Меркасур, у які тады ўваходзіла яшчэ і Венесуэла, пачаліся ў 1999 годзе і ішлі, мякка кажучы, не надта паспяхова. Гісторыя ўзаемадзеяння двух блокаў была напоўнена драматычнымі момантамі, калі бакі літаральна выпрабоўвалі адзін аднаго на трываласць. Двойчы (у 2004-м і 2012-м) дыялог перарываўся праз няўступлівасць еўрапейцаў у пытанні павышэння квоты на паўднёваамерыканскую сельгаспрадукцыю, асабліва на цукар і ялавічыну. Не так ужо лёгка было дамовіцца і самім членам Меркасура ўнутры арганізацыі — з прычыны рознага ўзроўню развіцця прамысловасці і аграрнага сектара і часта рознанакіраваных інтарэсаў. Справа дайшла да таго, што некаторыя палітолагі і эканамісты наогул казалі пра магчымы распад інтэграцыйнага аб'яднання, настолькі сур'ёзныя рознагалоссі выклікала пагадненне з ЕС. Гістарычны дагавор саспеў не толькі па прычыне доўгіх перамоў. Еўрасаюз, па звестках Reuters, з'яўляецца найбуйнейшым гандлёвым і інвестыцыйным партнёрам Меркасур. Летась сукупны экспарт прадпрыемстваў з ЕС склаў 45 мільярдаў еўра, адначасова з краін паўднёваамерыканскага блока ў Еўропу было пастаўлена тавараў на суму €42,6 млрд.

Другая цягам года гандлёвая мегаздзелка ЕС (калі лічыць таксама грандыёзную дамову з Японіяй) складзеная на фоне росту пратэкцыянізму ў свеце і гандлёвых войнаў паміж дзвюма найбуйнейшымі эканомікамі планеты — ЗША і Кітаем. Яна стала не толькі адлюстраваннем адрозненняў у поглядах на сусветны гандаль паміж адыходзячай Еўракамісіяй і прэзідэнтам ЗША Дональдам Трампам, але і доказам таго, што на заключэнне гандлёвых пагадненняў сыходзяць гады і нават дзесяцігоддзі.

«Гэта — гістарычны момант, і, паверце, я старанна выбіраю словы, — сказаў прэзідэнт Еўракамісіі Жан-Клод Юнкер (дарэчы, яго паўнамоцтвы як кіраўніка ЕК завяршаюцца ў канцы кастрычніка. — **«Зв.»**). — Пагадненне сэканоміць абодвум бакам чатыры мільярды еўра пошлін у год, што робіць яго найбуйнейшым у гісторыі ЕС. Сярод нарастання напружанасці ў міжнародным гандлі мы пасылаем нашым амерыканскім партнёрам выразны сігнал пра тое, што выступаем за гульню па правілах».

Перамогі на гэтым фронце прыносяць Еўропе ачкі як у спаборніцтве за лідарства ў свеце, так і ў барацьбе за адзінства уласных шэрагаў у кантэксце рашэння Вялікабрытаніі пакінуць ЕС. Прыхільнікі брэксіту сцвярджаюць, што ў адзіночку Лондан хутка дамовіцца з усімі краінамі аб выгадным гандлі. Праціўнікі кажуць, што ад імя найбуйнейшага ў свеце адзінага рынку ЕС дамаўляцца прасцей, ды і ўмовы лепшыя. Іх аргумент — за апошнія пяць гадоў ЕС заключыў паўтара дзясятка гандлёвых пагадненняў, у тым ліку эпахальныя здзелкі з Канадай і Японіяй.

ПАРМЕЗАН ПАД АБАРОНАЙ

Аднак урачыстае падпісанне, абмен ручкамі і папкамі з дагаворам яшчэ не азначаюць, што бяспошлінныя нямецкія BMW даедуць да Патагоніі, а бразільская ялавічына заваліць нямецкія супермаркеты. Ратыфікаваць здзелку будуць ужо іншы Еўрапарламент і іншая Еўракамісія. Да восені ўлада ў ЕС абновіцца, і ёй давядзецца зноўку дамаўляцца з незадаволенымі, перш за ўсё з фермерамі Францыі, Германіі і асабліва Ірландыі. На процілеглым беразе акіяна здзелцы пагражае ўздым левага папулізму ва ўнутранай палітыцы. Перш за ўсё ў Аргенціне, дзе на кастрычніцкіх прэзідэнцкіх выбарах прыхільнік адкрытай эканомікі Маўрысіа Макра рызыкуе саступіць уладу праціўнікам гандлёвага пагаднення з ЕС.

Бразілія і Аргенціна наогул неахвотна дапускаюць чужынцаў на свой рынак, і пагадненне з ЕС заклікана дапамагчы ім выйсці з гавані пратэкцыянізму ў адкрытыя воды свабоднага гандлю. Да гэтага часу самай істотнай спробай было стварэнне Меркасур. Аднак за амаль 30 гадоў членам гэтай арганізацыі так і не ўдалося дамовіцца паміж сабой. Яны не змаглі стварыць ні паўнавартаснага мытнага саюза, ні адзінага рынку. Буйная здзелка з ЕС можа надаць паскарэнне кантынентальнаму гандлёваму праекту. За гэта выступае новы прэзідэнт Бразіліі Жаір Балсанару — «трапічны Трамп» з вельмі ліберальнай эканамічнай праграмай. «Гістарычны момант! Адно з найважнейшых гандлёвых пагадненняў усіх часоў прынясе велізарную карысць нашай эканоміцы. Вялікі дзень!» — напісаў ён у «Твітэры». Яго надзеі звязаныя перш за ўсё з гатоўнасцю Еўропы прыадкрыць самы абаронены таварны рынак — сельскагаспадарчы. ЕС паабяцаў выдзеліць квоты на ялавічыну, мяса птушкі і цукар.

У адказ краіны Меркасур адменяць імпартныя тарыфы на еўрапейскую прадукцыю, якія цяпер складаюць ад 14 да 20 працэнтаў на хімікаты, прамысловае абсталяванне і лекі і 35 працэнтаў — на аўтамабілі, вопратку і абутак. І ў дадатак дазволяць бязмытны ўвоз віна, кандытарскай прадукцыі, моцнага алкаголю і сыроў, якія цяпер абкладаюцца па стаўках ад 20 да 35 працэнтаў. Адначасова паўднёваамерыканцы падпісаліся пад абаронай геаграфічных указанняў еўрапейскіх далікатэсаў: яны забароняць мясцовым вытворцам называць свой сыр, напрыклад, пармезанам, а вяндліну — пармскай.

СКРЫНЯ ПАНДОРЫ

Яшчэ мінулай восенню прэзідэнт Францыі Эмануэль Макрон адмаўляўся падпісваць гэтае пагадненне, таму што Балсанару пагражаў услед за ЗША выйсці з Парыжскага кліматычнага пагаднення. Цяпер у тэкст унеслі абавязацельства Бразіліі, якую эколагі абвінавачваюць у бяздумнай высечцы трапічных лясоў, змагацца са зменай клімату. Макрон асцярожна пагадзіўся, папярэдзіўшы, што будзе вельмі ўважліва сачыць за развіццём гэтага гандлёвага пагаднення — з прыцэлам на абарону не толькі планеты ў цэлым, але і французскіх фермераў у прыватнасці. А яны вельмі незадаволеныя. «Пагадненне з Меркасур непрымальнае, яно абернецца нядобрасумленнай канкурэнцыяй супраць нашых фермераў і татальным падманам спажыўца. Не вязіце сюды нікому не патрэбную сельгаспрадукцыю і ежу!» — заклікаў Крысціян Ламбер, кіраўнік найбуйнейшага французскага прафсаюза работнікаў сельскагаспадарчай галіны.

У Еўропе шмат сямейных фермаў, жорсткія правілы абароны жывёл, абмежаванні на прымяненне лекаў і пестыцыдаў. Гэта дорага, і фермеры баяцца наплыву таннай заакіянскай прадукцыі аграхолдынгаў, не абцяжараных еўрапейскімі абмежаваннямі, адзначае «Бі-бі-сі». «Здзелкай з Меркасур цяперашняя Еўракамісія адкрывае «скрыню Пандоры» падвойных стандартаў у сельскай гаспадарцы», — выступіў ад імя еўрапейскага аб'яднання фермерскіх саюзаў Copa-Cogeca яго генеральны сакратар Пека Песанен і заклікаў ЕС перагледзець дамову пасля абнаўлення Еўракамісіі гэтай восенню.

А ў цяперашнім выглядзе пагадненне не падтрымае парламент Ірландыі, упэўненая фермерская асацыяцыя краіны. Кароўнікі прыносяць Ірландыі тры мільярды еўра штогод, і яна залежыць ад вытворчасці ялавічыны як ніхто іншы ў ЕС. «Гэты дагавор — вынік закулісных дамоўленасцяў і пакланення перад буйнымі кампаніямі накшталт Mercedes і BMW. Іх хвалююць толькі продажы машын у Паўднёвую Амерыку. Гэта ганебная здача значнай часткі нашага самага каштоўнага рынку ялавічыны лацінаамерыканскім каўбоям і аграхолдынгам», — незадаволены прэзідэнт Асацыяцыі фермераў Ірландыі Джо Хілі.

Еўракамісія прызнала, што пагадненне «абяцае некаторыя складанасці еўрапейскім фермерам», і паабяцала выдатковаць да 1 мільярда еўра на субсідыі.

«Каб дагавор стаў узаемавыгадным, мы будзем старанна вызначаць квоты на сельскагаспадарчую прадукцыю з краін Меркасур з мэтай выключыць рызыку яе наплыву на еўрапейскі рынак і пагрозу дабрабыту фермераў у ЕС», — паабяцаў еўракамісар Філ Хоган. Так што перспектыва разгортвання найбуйнейшага сусветнага рынку пакуль пад пытаннем. Мост праз Атлантыку даволі хісткі.

Захар БУРАК.